**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**
**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за жнівень 2016 г.**

**Мерапрыемствы ў рамках раённага конкурсу**
**“Летам з кнігай я сябрую”**

**4 жніўня**

У форме бібліякарагода "Любим в игры мы играть, книги разные читать! " прайшло пасяджэнне аматарскага клуба “Бригантина”. Юныя кнігалюбы прынялі ўдзел у літаратурных віктарынах "Волшебные слова", "Угадай голос", "Посмотри и отгадай", а таксама ў бліц-турніры "События сказочных стран", з задавальненнем адгадвалі загадкі і павесяліліся ў забаўляльных гульнях і конкурсах.

Гарадзецкая СБ, 10 чал.

**5 жніўня**

У рамках Міжнароднага дня святлафору адбылася конкурсна-гульнёвая праграма “В городе дорожных наук”. Вучні 1 – 5 класаў школ горада паглядзелі інсцэніроўку на вершы С. Міхалкова “Бездельник - Светофор”, прынялі ўдзел у віктарынах, гульнях, конкурсах. Дзеці атрымалі веды, як не парушаць правілы дарожнага руху, як весці сябе ў грамдскім транспарце, што трэба рабіць, каб падарожжы за межы гораду не прынеслі непрыемстваў і чаму патрэбны дарожныя знакі.

ДБ, 15 чал.

**8 жніўня**

На пасяджэнні аматарскага клуба "Почемучки" адбылася інфармацыйна-конкурсная праграма "По страницам любимых книг". Рабяты здзейснілі займальнае падарожжа ў свет джунглеяў па старонкам кніг Р. Кіплінга “Маўглі”, пазнаёміліся з біяграфіяй М. Носава і яго кнігай “Жывая шляпа”, адказалі на пытанні віктарыны "Узнай героя", прынялі ўдзел у конкурсе "Подскажи словечко". Усе удзельнікі пасяджэння ўзнагароджаны медалямі.

Лелікаўская ПБ, 9 чал.

**12 жніўня**

Адбылася гадзіна цікавай інфармацыі “Дискуссионные качели”, на якой рабяты падзяліліся ўражаннямі ад прачытанных кніг, рэкамендавалі сябрам самыя спадабаныя выданні, з задавальненнем адказвалі на пытанні віктарыны. У завяршэнні мерапрыемства юныя апаненты знайшлі формулу бяспечнага і карыснага адпачынку летам.

Гарадзецкая ПБ, 9 чал.

**19 жніўня**

Падчас творчай майстэрні "Наши руки - не для скуки!» рабяты асвойвалі розныя тэхнікі рукадзелля, навучыліся самастойна вырабляць дэкаратыўныя

вырабы: паштоўкі, падарункавыя скрыначкі, віншавальныя канверты ў тэхніцы квілінгу; бірулькі і браслеты ў тэхніцы макрамэ; упрыгожванні з пацерак, гузікаў і дроту; фенечкі з нітак мулінэ; шкатулкі з газетных трубачак і многае іншае…

Дзівінская ПБ, 16 чал.

**19 жніўня**

На свяце казачных прыгод «День рождения Бабы Яги» рабяты прынялі актыўны ўдзел у танцавальным конкурсе «Море, а над морем чайки», гульнях «Вперёд четыре шага», «Бег в шапке и галошах», адказвалі на пытанні віктарыны, адгадвалі загадкі, чыталі вершы – віншаванні для Бабы Ягі. Кожны ўдзельнік свята атрымаў салодкі прыз.

Гарадзецкая ПБ, 15 чал.

**25 жніўня**

Адбылася конкурсна-гульнёвая праграма «Размышлялки, удивлялки и многое другое», на якой рабяты прынялі ўдзел у конкурсах «Удиви меня», «Чехарда»; віктарынах «Узнай меня, если сможешь», «Рассмеши красавицу». Завяршэннем мерапрыемства сталі пасядзелкі «С книжкой на скамейке».

Навасёлкаўская ПБ, 25чал.

**25 жніўня**

Літаратурна-гульнёвы урок «Играем, отдыхаем, читаем» сабраў рабят, якія дапамаглі аформіць кніжную выставу «Летнее настроение с книгой» спадабаўшыміся кнігамі. Кожны з іх расказаў аб прачытанай кнізе і парэкамендаваў яе прачытаць іншым. Дзеці малявалі любімых герояў кніг, адказвалі на пытанні віктарыны «Сказочная страна». Конкурс «Золотой формуляр» выявіў актыўных рабят – Сільчук Яўгенію, Антонаву Ксенію і Кокарэву Валерыю. Пераможцы атрымалі займальныя прызы.

Арэхаўская ПБ, 15 чал.

## <u>Іншыя мерапрыемствы</u>

**12 жніўня**

Пасяджэнне аматарскага клуба “Кругазор” прысвечана пытанням бяспечных паводзін у летні перыяд. У форме слайд-шоу «Жизнь прекрасна, когда она безопасна» на прыкладах відэапрэзентацыі бібліятэкар пазнаёміла рабят з правіламі паводзін на дарогах, на прыродзе, на вадзе.

Навасёлкаўская ПБ, 9 чал.

**12 жніўня**

Для супрацоўнікаў публічных бібліятэк сістэмы праведзена творчая лабараторыя «Клубы по интересам – как одна из форм проведения досуга пользователей библиотеки”. У рамках мнагамэтавага мерапрыемства прайшоў майстар-клас “Привлекая – увлекать”. Бібліятэкары паказалі відэапрэзентацыі аб рабоце лялечных гурткоў, аб напрацоўках у дзейнасці клубаў для розных катэгорый насельніцтва. У канцы вучобы, у час круглага стала выпрацаваны рэкамендацыі па ўдасканальванню дзейнасці аматарскіх клубаў бібліятэк рэгіёну.

ЦБ, 45 чал.

**14 жніўня**

Свята вёскі, прысвечанае 95-годдзю з дня першага ўпамінання “Як на вясковых імянінах” прайшло ў вёсцы Зосіно. Бібліятэкар пазнаёміла жыхароў з

гісторыяй вёскі, арганізавала гісторыка-дакументальную фотавыставу "Мая вёска – мой лёс", адзін з раздзелаў якой прысвечаны жыхарам вёскі – удзельнікам Вялікай Айчынай вайны. З канцэртнай праграмай для жыхароў выступілі ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці аўтаклуба Кобрынскага раёну.

Лукская ПБ, 100 чал.

**19 жніўня**

Пасяджэнне аматарскага клуба "Терница", прысвечанае народнаму святу "Спас", адбылося ў форме вячорак "Спасовский разгуляй". Удзельнікі клуба, госці мерапрыемства дазналіся аб гісторыі свята, прынялі ўдзел у конкурсах "З'еш яблык", "Назаві казку", "Яблычная карусель" і інш. Скончыліся вячоркі чаяваннем з яблычнымі пірагамі, якія прыгатавалі ўдзельнікі клуба.

Стрыгаўская ПБ, 26 чал.

**19 жніўня**

На гадзіне вольнага часу "Загляните в семейный альбом» у час пасяджэння клуба "Гаспадынька", прагучалі асабістыя гісторыі ўдзельнікаў клуба, дзе падкрэслівалася важнасць паважлівых адносін да свайго роду, расказана пра важнейшыя сямейныя традыцыі , якія пераходзяць з пакалення ў пакаленне.

Акцябрская ПБ, 10 чал.

**19 жніўня**

Адбылася сустрэча з членамі прэзідыума абласнога Савета народных дэпутатаў. Для сабраўшыхся прадстаўлена відэапрэзентацыя «Информационное обеспечение, формирование культуры граждан», якая пазнаёміла з работай публічных бібліятэк Дзяржаўнай установы культуры "Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма".

ЦБ, 32 чал.

**24 жніўня**

У час пасяджэння аматарскага клуба "Цудоўныя імгненні" прайшла інфармацыйна-гульнёвая праграма "Бібліятэчныя дажынкі". Рабяты пазнаёміліся з гісторыяй святкавання дажынак на беларускай зямлі, прынялі ўдзел у гульнях "Працягні прымаўку", "Хто адгадае?", чыталі па ролях беларускую народную казку "Лёгкі хлеб". Увазе дзяцей прапанаваны работы з саломкі і кароткае паведамленне па іх вырабу.

Хабовіцкая ПБ, 11чал.

## <u>Выдавецкая дзейнасць</u>

Бібліёграфамі аддзела абслугоўвання і інфармацыі выдадзены гісторыка-краязнаўчы нарыс "Дзівінскі шлях: гісторыя і дзень сённяшні» і буклет пад назвай "Старонка мая – непаўторны куток", прысвечаныя 550-годдзю в. Дзівін.

Выканаўца Раманюк Н. В.
Тэл. 2 36 81